**Тэма: Развіццё складовага аналізу і сінтэзу**
**Мэта:** развіццёнавыкаўскладовага аналізу і сінтэзу
**Задачы:**
*Карэкцыйна-адукацыйныя:*

- замацаваць веды аб ролі галосных гукаў в складзераздзеле;
- развівацьуменне вызначаць колькасць і паслядоўнасць складоў ў словах;
- вучыць дыферынцыравацьсловы рознай складовай структуры;
- пашырыць слоўнікавы запас

*Карэкцыйна-развіваючыя:*

- развіваць слыхавое ўспрыманне і навыкі запамінання слоў;
- развіваць лагічнае мысленне пры выкананні практыкаванняў на аналітыка-сінтэтычную дзейнасць;

*Карэкцыйна-выхаваўчыя:*

- выхоўваць станоўчыя адносіны да вучэбнай працы

**Абсталяванне:** карта вывучэння тэмы «Маўленне. Сказ. Слова»; картка з пытальнікам; дэманстрацыйны і раздатачны матэрыял, схемы слоў з рознай колькасцю складоў, паветраныя шары

**I Арганізацыйны момант**

Стварэнне эмацыянальнага настрою

Прывітанне

Практыкаванне *“Дабро камень грэе”*

Возьмем у далонькі каменьчык і разагрэем яго добрымі , а значыць цёплымі словамі

Кінезеалагічнае практыкаванне *“Кнопкі мозга”*

**II Асноўная частка**

1. – Сёння мы працягваем падарожнічаць па краіне Мовы. І з намі ў падарожжа адпраўляецца вельмі цікаўны хлопчык Чамучык.

***Практычная работа па вызначэнні на слух колькасці сказаў.*** Вучні стоячы слухаюць тэкст. Канец кожнага сказа адзначаюць“кропкай”–прысядаюць. *Наступіла зіма. Сонейка свеціць, ды не грэе. Выпаў бялюткі снег. Дзяцей чакаюць зімовыя гульні.*

– Хто быў уважлівым? Колькі сказав пачулі?

***Практычная работа па вызначэнні колькасці слоў у сказе***

***Гульня “Жывая схема”.*** Вучні адлюстроўваюць адзін сказ з апавядання. *Выпаў бялюткі снег.*

**-**Колькі слоў у сказе? Колькі вучняў павінны выйсці да дошкі?

Кожны вучань будзе ўяўляць сабой адно слова.

- ✔ пачатак сказа – першы вучань падымае адну руку ўверх (сімвал пачатка сказа);
- ✔ кропка–выклікаецца і прысядае яшчэ адзін вучань (таму што

кропка–гэта самастойны знак);

✔ сувязь слоў у сказе–вучні бяруцца за рукі.

– Выдатна справіліся з тяжкім заданнем – пабудавалі жывую схему сказа.

– Я бачу, што хлопчык Чамучык задаволены!

2. Хлопчык Чамучык зацікавіўся: “ А ці могуць словы дзяліцца на часткі?”

– Каму з вас даводзілася дзяліць шакалад? Вам было цяжка гэта рабіць? *(Не.)*Чаму шакалад лёгка падзяліць на часткі?*(Ён складаецца з роўных частак асобныхкавалачкаў.)* А ці могуцьсловыдзяліцца начасткі –“маленькія кавалачкі”.

- На колькі частак можна падзяліць шакалад? *(Дзве,тры часткі…Многа.)* А слова “шакалад”? Каб даведацца, трэба са словам папрацаваць.Вымавім хорам слова “шакалад”.
- Цяпер паслухайце, як я яго вымаўляю: ша – ка – лад. На колькі частак падзялілася слова? *(На 3 часткі.)* Давайце ўсе разам паспрабуем вымавіць слова “шакалад” па частках. *(Вучні вымаўляюць.)* Цяжка дзяліць слова на часткі? Вядома, не.

***Увядзенне паняцця.***

- Часткі, на якія мы падзялілі слова “шакалад”, называюцца склады. Падзяліць слова на часткі–значыць, падзяліць слова на склады.
- Малайчыны! Вы пазналі яшчэ адзін сакрэт беларускай мовы: словы можна падзяліць на склады. І, канечне, цікаўны хлопчык Чамучык задумаўся: “Як утвараецца склад, як вызначаецца колькасць складоў у слове?” Думаю, у вас ёсць адказ на гэта пытанне. (колькі ў слове галосных, столькі і складоў)
  - Назавіце літары галосных гукаў

<u>*Правіла, звярнуцца да стужкі літар*</u>

**<u>III.</u> Практыкаванні ў вызначэнні колькасці складоў у словах**

**Развіццё складовага аналізу і сінтэзу**

Хлопчык Чамучык спяшаўся да вас са святочнымі шарамі, з цікавымі заданнямі і словамі. Раптам падуў моцны вецер і словы- шары пераблыталіся. Патрэбна дапамога.

1. развіццё складовага аналізу, замацаванне ведаў аб галосных і зычных
 - утварыце склады, злучыўшы зычны з галосным

*Ж+У*

*К+О і іншыя*

2.Прачытайце склады на паветраных шарах, утварыце словы

Словы запішыце, падзяляючы на склады

*Дуб, лі-са, со-ней-ка, аў-то-бус, за-яц, лес , ля-сок*

3. Гульня “Стукалачка”

Даецца малюнак, назву якога вымаўляюць па складах і слова патрэбна адстукаць мячом.

*Мышы, домік, гусь, карова*

4. Да кожнага малюнка складзіце схему слова. Колькі галосных гукаў?
Колькі складоў?

*Мышы, домік, лось, карова*

Які малюнак лішні?

5.Прачытайце. З выдзеленых літар складзіце назву звярка

*У грыбах*

*Хто сар**в**аў мой грыбо**к**?*
*Пышнах**в**осты звя**р**ок.*
*Мне **ё**н хвосцікам махнуў*
*і  н**а** дрэва сіг**а**нуў.*

Н.Галіноўская

6. Рассяліць жывёл  па вагончыках . Пад нумарам адзін паедуць жывёлы у назве якіх 1 склад (*конь, кот*), пад нумарам 2 – 2 склады (*качка, каза*), 3- 3 склады(*курыца, сабака)*

7. Прачытайце словы першага радка. Падзяліце іх на склады.З кожнага слова першага радка выдзеліце склад, які трэба дадаць у словы другога радка.Якія словы атрымаліся?

*Бульба,     гайка,     журавель*

*Ба-ка         ра-      -кета*

8. Работа над тэкстам. Прачытаць, пераказаць урывак па малюнку.Выдзеленыя словы падзяліць на склады

*Спазніліся*

*Пасля дажджуАня з дзядулем **накіраваліся** ў лес па грыбы. У густым бары яны натрапілі на палянку **баравікоў**. Грыбы былі яшчэ маленькія. Дзядуля прапанаваў пакінуць іх. Падрастуць яшчэ!*

*На наступны дзень Аня з дзядулем прыйшлі на палянку. Што яны убачылі? Над баравікамі шчыравалі **жвавыя** вавёркі. Побач на галінках дрэва былі нанізаны грыбы. Вавёркі запасалі іх на зіму.*

*Дзядуля з унучкай вырашылі не турбаваць **звяркоў**. Яны з цікавасцю глядзелі на вавёрак.*

IY . **Падвядзенне выніку**

Дыдактычная гульня**. « Так і не так»**

Развіццё функцій фанематычнага слыху, сладовага аналізу.

- «лімон»- 1склад склад « ЛІ »
- « апельсін» -2 склад « СІН»
- « яблык» - 3 склады
- « пералётныя» - 3 гук «Р»
- «дрэва»- пасля «эР» пішам «Э»
- «цёплая» - 2 склады

**Y Рэфлексія «Лесвица настрою»**

У кожнага вучня на парце картонны чалавечак. І лесвіца з трымя приступкамі, на якіх намаляваны тры мордачкі: вясёлая, спакойная, сумная.

Выбіраюць прыступку для чалавечка.

Спазніліся

Пасля дажджу Аня з дзядулем *накіраваліся* ў лес па грыбы. У густым бары яны натрапілі на палянку *баравікоў*. Грыбы былі яшчэ маленькія. Дзядуля прапанаваў пакінуць іх. Падрастуць яшчэ!

На наступны дзень Аня з дзядулем прыйшлі на палянку. Што яны убачылі? Над баравікамі шчыравалі *жвавыя* ваверкі. Побач на галінках дрэва былі нанізаны грыбы. Ваверкі запасалі іх на зіму.

Дзядуля з унучкай вырашылі не турбаваць *звяркоў*. Яны з цікавасцю глядзелі на вавёрак.

У грыбах

Хто сар**в**аў мой грыбо**к**?

Пышнах**в**осты звя**р**ок.

Мне **ё**н хвосцікам махнуў

і н**а** дрэва сіг**а**нуў.

Н.Галіноўская